У першую няделю пасля Вялікадня ад 2000 года каталіцкі свет перажывае **свята Божай Міласэрнасці**
. Усталявана яно па просьбе самога
Пана Езуса
, які падчас аб'яўленняў святой Фаўстыне Кавальскай, неаднаразова заклікаў: "Я жадаю, каб было свята Божай Міласэрнасці." Сярод іншых формаў ушанавання Божай Міласэрнасці- гэта свята з'яўляецца самым важным.

У **Лучайскім касцёле святога Юды Тадэвуша, Апостала**, падчас нядзельнай Літургіі маліліся ў інтэнцыі ўдзельнікаў малітоўнага апостальства "Маргарыткі"і за святароў, за якіх паўсталі малітоўныя группы. А таксама святая Імша адпраўлялася аб Божым бласлаўленні для ксяндза Мікалая, які неўзабаве адзначыць дзявятую гадавіну святарства.

Гамілію святар прысвяціў тэме Божай Міласэрнасці, якая цесна звязана з таямніцай Уваскрашэння.

Напрыканцы набажэнства парафіяне і землякі з Шаркаўшчыны павіншавалі ксяндза Мікалая з чарговай гадавінай святарства. Шаркаўшчынская паэтка Кацярына Сосна падаравала чарговы верш-віншаванне:

"Цярністы шлях Вы выбралі аднойчы.

Так Бог рашыў і Вам па ім ісці:

Быць паслядоўнікам сваім прарочыў

І крыж нялёгкі па жыцці нясці…" (урывак)

Дарэчы, аўтарка з'яўляецца і ўдзельніцай "Маргарытак", моліцца ў інтэнцыі ксяндза Мікалая. Сімвалам малітоўнага руху з'яўляецца простая палявая кветка -рамонак, таму кошык з салодкімі рамонкамі стаў падарункам для Лучайскага пробашча. Кульмінацыйным момантам у віншаванні стала прысяга перад Богам і Касцёлам-маліцца ў інтэнцыі ксяндза Мікалая на працягу ўсяго жыцця. Сем шаркаўшчынскіх парафіянак ўрачыста паабяцалі вечную малітву. Традыцыйныя "Sto lat" у выкананні гурта "Laudans" і вернікаў падсумавалі святочныя віншаванні.



Адарацый Найсвяцейшага Сакраманту закончылася нядзельнае набажэнства. Вернікі памаліліся Вяночкам да Божай Міласэрнасці, які быў прадыктаваны Езусам святой сястры Фаўстыне, як малітва перапрашэння і ўтаймавання Божага гневу. Молячыся

Вяночкам, вернікі просяць аб "міласэрнасці для нас і ўсяго свету", такім чынам здзяйсняюць учынак міласэрнасці.

Гістарычным момантам свята стаў **пачатак перагрынацыі абраза Езуса Міласэрнага**, які будзе пераносіцца з хаты ў хату па парафіі. Запланавана перагрынацыя ў рамках Юб
і
лейнага Года М
іласэрнасці і
святкавання 250-годдзя заснавання Лучайскай святыні, якое адзначаецца сёлета. Абраз паказвае ўваскрослага Збаўцу, які прыносіць людзям спакой праз адпушчэнне грахоў цаною сваёй мукі і крыжовай смерці. Пан Езус даў наступныя абяцанні ўсім, хто будзе яго ушаноўваць
:
"Праз гэты абраз Я буду ўдзяляць душам шмат ласкаў, а таму няхай кожная душа мае да яго доступ." Першая сям'я, да якой накіруецца абраз
– гэта бацькі ксяндза Мікалая. Воляй лёсу сталася, што з выхадам на заслужаны адпачынак яны перабраліся ў роднай Шаркаўшчыны ў Лучай і з'яўляюцца першымі і галоўнымі памагатаямі свайму сыну.



Здаецца, ўсё ў гэты дзень было прысвечана культу Божай Міласэрнасці. Святочны канцэрт, які падараваў прысутным добра вядомы гурт "*Laudans*" з Мінска, быў часткова складзены як з песень на словы святога Яна Паўла
II
і ксяндза Яна Твардоўскага, так і з разважанняў
святой Фаўстыны Кавальскай
.
Гэта манахіня з Кангрэгацыі Сясцёр Маці Божай Міласэрнасці, якую Пан Езус выбраў сакратаркаю і апосталкаю сваёй міласэрнасці, каб праз яе перадаць свету вялікае пасланне. Збаўца сказаў святой сястры Фаўстыне: "У Старым Запавеце Я пасылаў свайму народу прарокаў з громам. Сёння Я пасылаю цябе да ўсяго чалавецтва з Маёю міласэрнасцю. Я не хачу караць збалелага чалавецтва, а прагну яго вылечыць, прытуляючы да свайго міласэрнага сэрца."

Традыцыйна ксёндз Мікалай падзякаваў прысутным за ўдзел, а артыстам за цудоўны выступ і, паблаславіўшы на шчаслівае вяртанне дамоў, запрасіў на бліжэйшы **фэст новага сезону ў гонар святога Андрэя Баболі, які запланаваны на суботу 14 мая.**

Тэкст: Алена Клімза-Колтан. (паводле luchai.by)

Фота: Зміцер Лупач

Відэазапіс са свята.